УДК 37.015(045)

**Г. У. Болбас**
Кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры педагогікі, УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна», г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

# МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ГЕНЕЗІСУ ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫХ АСНОЎ ПРЫРОДАЗГОДНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ

*У артыкуле абгрунтоўваецца метадалагічная матрыца даследавання генезісу феномена прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі. Аўтарам вызначаюцца даследчыцкія ўстаноўкі і планы, якія забяспечваюць арганізацыю гісторыка-педагагічнага пазнання і абумоўліваюць базавыя, парадыгмальныя і інструментальныя метадалагічныя падыходы да вывучэння працэсаў станаўлення і развіцця педагагічнай з'явы. Сістэмнасць і комплекснасць дадзеных падыходаў звязваецца са спецыфікай гісторыка-педагагічнага даследавання, якая праяўляецца ў сінтэзе педагагічнай і гістарычнай навук.*

*Ключавыя словы: прыродазгоднае выхаванне, педагагічная думка Беларусі, генезіс, даследчыцкія ўстаноўкі, даследчыцкія планы, метадалагічныя падыходы, метадалагічная матрыца.*

**Уводзіны**

Метадалогія навуковага даследавання забяспечвае канцэпцыю, логіку і арганізацыю практычнай дзейнасці па вывучэнні навуковых ведаў, абумоўлівае даследчыцкія ўстаноўкі і спосабы інтэрпрэтацыі атрыманых вынікаў. Метадалагічныя асновы вывучэння генезісу феномена прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі дэтэрмінаваны спецыфікай гісторыка-педагагічнага пазнання і, адпаведна, прадстаўлены інструментарыем, эфектыўным для даследавання з'яў у структуры і кантэксце гісторыка-педагагічнага працэсу. Шэраг вучоных-метадолагаў, гісторыкаў педагогікі (С. В. Бабрышоў, М. В. Багуслаўскі, І. А. Калеснікава, Г. Б. Карнетаў, М. С. Розаў, А. М. Шэвелеў, І. Я. Шкабара і інш.) вызначаюць і абгрунтоўваюць метадалагічныя падыходы, аптымальныя для гісторыка-педагагічных даследаванняў. М. В. Булыгіна актуалізуе пытанні метадалогіі гісторыка-педагагічных даследаванняў рэгіянальнага ўзроўню, паказваючы на абумоўленасць метадалагічных падстаў не толькі кантэкстам, але і яго маштабам, а таксама нацыянальнай спецыфікай лакальнага гістарычнага вопыту [1]. Акрамя гэтага, значным для даследавання з'яўляецца вывучаемы педагагічны феномен, у нашым выпадку – прыродазгоднае выхаванне, змястоўнае і сутнасна-сэнсавае напаўненне якога будзе шмат у чым вызначаць падыходы да яго інтэрпрэтацыі ў гістарычнай дынаміцы. Фрагментарнасць даследавання працэсаў зараджэння і развіцця прыродазгоднага выхавання ў айчыннай педагогіцы абумовіла адсутнасць аналізу метадалагічных падыходаў да вывучэння дадзенай з'явы. Такім чынам, мэта артыкула заключаецца ў вызначэнні метадалагічнай матрыцы даследавання генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі.

**Метады і метадалогія даследавання**

Метады і метадалогія даследавання абумоўлены адзначанай мэтай, у выніку чаго прадстаўлены структурна-сістэмным і анталагічным падыходамі, метадамі аналізу навуковай літаратуры, параўнальнага і прычынна-выніковага аналізу, абагульнення і сістэматызацыі.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне**

Выбар метадалагічных падыходаў даследавання генезісу феномена прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі абумоўлены сістэмай даследчыцкіх установак, якія забяспечваюць арганізацыю гісторыка-педагагічнага пазнання. Яны прадстаўлены дзвюма групамі і ўдакладняюць пазіцыі адносна прадмета і кантэксту даследавання.

І. Даследчыцкія ўстаноўкі, што ўдакладняюць сэнсавае значэнне паняццяў, якія вызначаюць прадмет даследавання:

© Болбас Г. У., 2025

МГПУ им. И.П. Шамякина

1. Прыродазгоднае выхаванне – напрамак педагагічнай тэорыі і практыкі, заснаваны на безумоўным прыярытэце агульных законаў развіцця прыроды, глыбокіх навуковых ведах аб прыродзе чалавека, якія вызначаюць яго патрэбнасці, магчымасці і здольнасці ў працэсе развіцця і фарміравання, а таксама неабходнасць гарманізаваць адносіны асобы з асяроддзем яе жыццядзейнасці. Выхаванне ў дадзеным азначэнні інтэрпрэтуецца ў шырокім сэнсе: у адзінстве і цэласнасці працэсаў авалодання ведамі, уменнямі, навыкамі і фарміравання якасцей асобы.

2. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы прыродазгоднага выхавання прадстаўлены сукупнасцю светапоглядных ідэй, гнасеалагічных канцэпцый фарміравання канстытутыўна-рэгулятыўных, каштоўнасна-мэтавых і змястоўна-працэсуальных асноў прыродазгоднага выхавання як навуковага феномена. Паняцце “ідэі прыродазгоднага выхавання” ў рамках даследавання не падмяняе “тэарэтыка-метадалагічныя асновы”, а сведчыць аб тым, што апошнія фарміраваліся на працягу доўгага перыяду праз акумуляцыю і сістэматызацыю ідэй.

3. Генезіс – “дэтэрмінаваны ўзаемадзеяннем розных фактараў працэс эвалюцыі з’яў, поглядаў, вучэнняў, які праходзіць у сваім развіцці пэўныя стадыі і характарызуецца з’яўленнем вытокаў, узнікненнем перадумоў новага ў нетрах старога, што прыводзіць да зараджэння, якаснага прырашчэння і станаўлення новай з’явы, погляду, ідэі” [2, с. 5].

4. Аперыраванне ў даследаванні паняццем “Беларусь” мэтазгодна і аптымальна ў кантэксце працяглага гістарычнага прамежку, які адлюстроўвае на кожным этапе складаны шлях фарміравання тэрыторыі і ў цэлым народнасці, этнасу і дзяржавы. Дадзенае паняцце шматзначнае і вызначаецца сутнаснымі характарыстыкамі: тэрытарыяльна-геаграфічнымі, сацыяльна-культурнымі, этнанацыянальнымі, дзяржаўна-палітычнымі. Беларуская дзяржаўнасць, на думку айчынных гісторыкаў, прадстаўляе “непарыўнае цэлае”, нягледзячы на тое, што знайшла ўвасабленне ў разнастайных гістарычных (Полацкае і Тураўскае княствы, Кіеўская Русь, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і іншых земляў, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя) і нацыянальных (Беларуская Народная Рэспубліка, Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь, Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі, Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, Рэспубліка Беларусь) формах [3, с. 14]. Вызначаныя даследчыкамі “палілінгвізм, мультыкультурнасць, трансгранічнасць і шматнацыянальнасць беларускай культуры” не перашкаджалі захоўваць цэласнасць традыцый у сваёй нацыянальнай спецыфіцы [4, с. 32].

II. Даследчыцкія ўстаноўкі, якія раскрываюць асаблівасці інтэрпрэтацыі гісторыка-педагагічнага працэсу як кантэксту даследавання:

1. Гісторыка-педагагічны працэс выступае элементам гісторыка-культурнага працэсу.

2. Гісторыка-педагагічны працэс прадстаўлены сінкрэтычным адзінствам працэсаў развіцця педагагічнай думкі і практыкі адукацыі.

3. Гісторыя развіцця тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ажыццяўляецца не па храналогіі мысліцеляў, а згодна з храналогіяй развіцця педагагічных ідэй, якія прадстаўляюць вывучаемы педагагічны феномен.

4. Нараўне з тэрмінам “педагагічная думка” выкарыстоўваюцца паняцці “філасофска-педагагічная думка”, “рэлігійна-філасофскія вучэнні”, што паказвае на зараджэнне і фарміраванне ўласна педагагічных ідэй і поглядаў, да якіх адносяцца таксама ідэі прыродазгоднага выхавання, у рамках рэлігійных і філасофскіх ведаў.

5. Развіццё феномена прыродазгоднага выхавання ў айчыннай педагагічнай думцы прадстаўлена не толькі ў працах вядомых, але і ананімных аўтараў. У пэўныя перыяды яго генезісу актуалізаваліся і атрымлівалі распаўсюджванне на беларускіх землях ідэі візантыйскіх багасловаў, антычных філосафаў, заходнееўрапейскіх мысліцеляў і інш., што дае падставы абапірацца на іх погляды ў даследаванні.

6. Педагагічная думка Беларусі як кантэкст даследавання прадстаўлена не толькі беларусамі, але і асветнікамі іншых нацыянальнасцей, што абумоўлена іх агульнай гісторыяй і культурай у перыяды ўваходжання беларускіх зямель у розныя дзяржаўныя ўтварэнні.

III. Даследчыцкія ўстаноўкі, якія раскрываюць асаблівасці мовы гісторыка-педагагічнага працэсу:

1. Навуковая мова гісторыка-педагагічнага даследавання выходзіць за рамкі педагагічнай навукі, што абумоўлена міждысцыплінарнасцю гісторыка-педагагічных ведаў, а таксама накіраванасцю ў цэлым гуманітарных навук на міжнавуковую камунікацыю.

2. Тэксты, якія адлюстроўваюць гісторыю развіцця даследуемага феномена, праламляюцца праз прызму сучасных педагагічных ведаў, што дазваляе вызначыць вытокі разумення з’явы

МГПУ им. И.П. Шамякина

прыродазгоднага выхавання, яго сэнсавыя прырашчэнні і мадыфікацыі. Аперыраванне сучаснай навуковай мовай падпарадкавана задачы выяўлення месца і ролі аўтарскай пазіцыі адносна структуры працэсу генезісу навуковых ведаў па лініі ад мінулага да сённяшняга [5, с. 28].

*Даследчыцкімі планамі*, накіраванымі на вызначэнне працэсаў і працэдур генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання, з'яўляюцца наступныя:

– працэсуальны, арыентаваны на выяўленне логікі і перыядаў фарміравання і развіцця даследуемага педагагічнага феномена;

– суб'ектны, накіраваны на вызначэнне суб'ектаў педагагічнай думкі Беларусі, якія транслююць ідэі прыродазгоднага выхавання і/ці рэалізуюць іх на практыцы;

– выніковы, сфакусіраваны на выяўленні меркаванняў, канцэпцый і тэорый, якія адлюстроўваюць ідэі прыродазгоднага выхавання;

– асяроддзевы, накіраваны на вызначэнне знешніх перадумоў генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання;

– функцыянальны, арыентаваны на выяўленне ўплыву даследуемага феномена на педагагічную навуку і адукацыйную практыку як у перыяды гістарычнага мінулага, так і сучаснага, будучага.

Даследчыцкія ўстаноўкі і планы абумоўліваюць метадалагічныя падыходы да вывучэння генезісу прыродазгоднага выхавання ў Беларусі. З прычыны таго што гісторыка-педагагічнае даследаванне ўяўляе сінтэз педагагічнай і гістарычнай навук, кожнай з якіх уласцівы свае падыходы і спосабы пазнання, заканамернай становіцца сістэмнасць і комплекснасць метадалагічных падстаў і прыёмаў аргументацыі, у нашым выпадку – адносна генезісу даследуемага феномена.

*Сістэму метадалагічных падыходаў* да даследавання генезісу прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі мэтазгодна прадставіць у адпаведнасці з узроўнямі метадалагічнай рэфлексіі трыма групамі: базавымі, парадыгмальнымі і інструментальнымі падыходамі.

У якасці ***базавых (агульнанавуковых)***, якія забяспечваюць "неабходную якасць даследчай праграмы з пункту гледжання адпаведнасці канонам гістарычнай навукі" і адлюстроўваюць "метадалагічнае самавызначэнне даследчыка" [5, с. 20–22], у працы выступаюць гісторыка-генетычны і сістэмны падыходы. Гісторыка-генетычны падыход найбольш эфектыўны ў даследаванні гісторыі працэсаў [6], у нашым выпадку – працэсу фарміравання тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання. Гістарычны аналіз дадзенага феномена нацэльвае на вызначэнне падзейнай канвы яго генезісу, асэнсаванне законаў яго развіцця ў адзінстве з "вонкавымі ўплывамі, якія дэтэрмінуюць іх дынаміку і трансфармацыю, а таксама самымі шырокімі гісторыка-культурнымі кантэкстамі, якія абумаўляюць іх успрыманне і трактоўку ў пэўных гістарычных абставінах пэўнымі людзьмі, іх узаемасувязь з іншымі педагагічнымі ідэямі, а таксама з педагагічнай практыкай" [7, с. 48]. Працэсы і з'явы сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Беларусі ў перыяд X – пачатку XXI стагоддзя ўяўляюць гістарычную рамку генезісу, вызначаюць рух і спецыфіку працэсу фарміравання ідэй прыродазгоднага выхавання.

Гісторыка-генетычны падыход у найбольшай ступені сфакусіраваны на выяўленні прычынна-выніковых сувязяў і заканамернасцяў генезісу даследуемай з'явы, на тым, каб "адшукаць у гісторыі крыніцы, перадумовы, асновы з'яўлення ведаў, прасачыць, якія этапы гэтыя веды прайшлі ў сваім станаўленні, якімі яны былі і якімі сталі" [8, с. 96]. Такі падыход важны не толькі для разумення гісторыі прыродазгоднага выхавання, але і вызначэння яго гістарычнай пераемнасці, выяўлення педагагічнага патэнцыялу для вырашэння сучасных праблем выхавання і вызначэння перспектыў развіцця ў педагагічнай думцы Беларусі. Яго выкарыстанне навукова мэтазгодна з прычыны вывучэння гісторыі прыватнай з'явы ў кантэксце агульнай гісторыі айчыннай педагагічнай думкі.

*Сістэмны падыход* забяспечвае поўнае і глыбокае вывучэнне тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў адзінстве і сістэмнасці яго канстытутыўна-рэгулятыўнага, каштоўнасна-мэтавага і змястоўна-працэсуальнага кампанентаў, дазваляе "больш канкрэтна апісаць прыкметы асноўных кампанентаў у складзе вывучаемай з'явы, а таксама іх асноўныя ўласцівасці" ў гістарычнай рэтраспектыве [9, с. 16].

Сістэмны падыход у сінтэзе з гісторыка-генетычным трансфармуе фрагментарнае бачанне феномена прыродазгоднага выхавання ў цэласнае ўяўленне аб ім праз уключэнне ў сістэму ўяўленняў пра чалавека і прыроду ў іх шматмернасці і шматаспектнасці. Адзінства такіх метадалагічных падыходаў забяспечвае выяўленне спецыфікі развіцця і фарміравання даследуемай педагагічнай з'явы ў яе анталагічнай паўнаце і цэласнасці, у адзінстве вонкавых і ўнутраных дэтэрмінант дадзеных працэсаў.

МГПУ им. И.П. Шамякина

***Парадыгмальныя падыходы*** дэтэрмінаваны тэорыямі і канцэпцыямі, якія абумоўліваюць сацыяльнае развіццё чалавецтва. Яны дазваляюць прадставіць гісторыка-педагагічны працэс у яго спіралепадобнасці і вызначаюць “парадыгмальны партрэт і сэнсанясучы каркас даследавання, фарміруюць яго спецыфічную мову, логіку доказаў, абумоўліваюць лініі ўзаемасувязяў з фактамі і падзеямі грамадзянскай гісторыі, гісторыяй развіцця культуры і навукі і г. д.” [10, с. 45]. Значнасць дадзеных падыходаў для нашага даследавання ўзрастае з прычыны іх магчымасцей “перыядызаваць” развіццё вывучаемага феномена.

Парадыгмальнымі падыходамі ў вывучэнні генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі выступаюць цывілізацыйны, аксіялагічны і культуралагічны.

Выбар цывілізацыйнага падыходу ў якасці метадалагічнага інструментарыя абумоўлены шэрагам прычын:

– магчымасцямі даследаваць феномен прыродазгоднага выхавання, уключаны ў шырокі сацыякультурны кантэкст, “з улікам спецыфікі ядзерных сацыяльных узораў, уласцівых розным культурна-гістарычным тыпам грамадстваў” [11, с. 149];

– важнасцю выяўлення крыніц і прычын тэндэнцый развіцця і спецыфікі даследуемай з’явы ў пэўным сацыякультурным асяроддзі;

– неабходнасцю руху ў аналізе генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання “ад лагічнай сутнасці педагагічных з’яў да аналізу іх канкрэтна-гістарычных мадыфікацый markaрознай ступені агульнасці, ад усеагульнага праз агульнае і асаблівае да адзінкавага і, наадварот, ад адзінкавага праз асаблівае і агульнае да ўсеагульнага” [12, с. 365–366].

Парадыгмальны сэнс катэгорыі “цывілізацыя” звязаны з яе здольнасцю выказваць “гістарыцыраваную прыроду чалавека праз прызму сукупнасці ўсіх формаў яго грамадскай жыццядзейнасці” [12, с. 360]. Г. Б. Карнетаў з пазіцый цывілізацыйнага падыходу вызначае іерархічныя ўзроўні аналізу гісторыка-педагагічнага працэсу (“чалавечая цывілізацыя” – “цывілізацыя-стадыя” – “вялікая цывілізацыя” – “лакальная цывілізацыя”), якія задаюць “ступень канкрэтызацыі педагагічных з’яў, тую сістэму сацыякультурных каардынат, у якой яны павінны разглядацца, суадносіны родавых і відавых прымет даследуемых феноменаў” [12, с. 95]. У кантэксце нашага даследавання дадзеныя ўзроўні дазваляюць ажыццявіць параўнальны аналіз развіцця ідэй прыродазгоднага выхавання ў заходнееўрапейскай і айчыннай педагагічнай думцы, якія суадносяцца як “вялікая цывілізацыя” і “лакальная цывілізацыя”. Апошняя, прытрымліваючыся інтэрпрэтацыі Г. Б. Карнетава, адлюстроўвае “натуральна дадзеныя ў гісторыі адзінкі, якія, маючы, як правіла, этнічную і/ці дзяржаўную пэўнасць і будучы звязанымі ўнутры сябе агульнасцю «ядзерных» сацыяльных адносін, культурных традыцый і ідэй, утвараюць спецыфічныя сацыякультурныя арганізмы” [13, с. 95]. Такое супастаўленне дазваляе выявіць агульнае і асаблівае ў гісторыі генезісу даследуемай педагагічнай з’явы. Што тычыцца “цывілізацый-стадый”, якія прадстаўляюць этап зліцця вялікіх і лакальных цывілізацый у “«метацывілізацыю» планетарнага маштабу” [12, с. 363], то яны суадносяцца з дыялогам педагагічных традыцый у дачыненні да феномена прыродазгоднага выхавання, а іх змена дазваляе перыядызаваць агульную гісторыю яго генезісу і выяўляць пераемныя сувязі ў развіцці.

*Аксіялагічны падыход* як найважнейшая канцэптуальна-метадалагічная падстава перыядызацыі генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання дазваляе прадставіць дадзены працэс праз дынаміку ўяўленняў аб прыродзе як каштоўнасці. Суразмернасць законаў прыродазгоднасці і ідэалазгоднасці сведчыць аб абумоўленасці феномена прыродазгоднага выхавання дамінуючымі ў пэўную эпоху каштоўнасцямі і робіць карэктным і мэтазгодным выбар дадзенага метадалагічнага падыходу. Бог, чалавек, натуральнае прыроднае асяроддзе, грамадства, культура як разнастайныя праявы прыроды на розных гістарычных этапах уяўлялі сабой вышэйшую каштоўнасць, якая дэтэрмінавала ў цэлым светапогляд чалавека і, у прыватнасці, педагагічныя погляды айчынных мысліцеляў. Аксіялагічны падыход вызначае для нашага даследавання каштоўнасна-сэнсавыя параметры прыродазгоднага выхавання, якія ва ўмовах гістарычнага развіцця змяняюцца і даюць падставу перыядызаваць працэс генезісу.

*Культуралагічны падыход* вызначае пераемнасць педагагічных традыцый і магчымасці актуалізацыі гісторыка-педагагічных ведаў у сучасных сацыякультурных умовах. Сутнасць прыродазгоднага выхавання, якая раскрываецца ў рэтраспектыве культурна-гістарычнага асэнсавання паняццяў “прырода” і яго шматлікіх праяў, заключае ў сабе каштоўнасныя падставы беларускай культуры X – пачатку XXI ст. Калі цывілізацыйны падыход у большай ступені зыходзіць з агульнага і стабільнага ў народаў, то культуралагічны перш за ўсё акцэнтуе ўвагу на праяве ў іх

МГПУ им. И.П. Шамякина

індывідуальнага і самабытнага. Адносна перыядызацыі генезісу гэты падыход дазваляе вызначыць этапы развіцця і фарміравання тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання з улікам спецыфікі развіцця нацыянальнай педагагічнай культуры.

Сістэмнасць і адзінства парадыгмальных метадалагічных прынцыпаў у кантэксце нашага даследавання дазваляюць раскрыць і аформіць з дапамогай інструментальных метадалагічных падыходаў канцэпцыю генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў цэласнасці і ўзаемасувязі яго сістэмаўтваральных знешніх і ўнутраных дэтэрмінант.

У ролі ***інструментальных падыходаў***, якія таксама служаць абгрунтаванню перыядызацыі генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання, правядзенню інтэрпрэтацыйнай працы з педагагічнымі з'явамі, у дадзеным даследаванні выступаюць анталагічны, фенаменалагічны і кампаратыўны.

*Анталагічны падыход* арыентуе на семантычную дакладнасць ключавых паняццяў і адэкватнае аперыраванне імі ў рамках даследавання. У стаўленні да прыродазгоднага выхавання гэта вельмі важна з прычыны яго шматстайных інтэрпрэтацый падчас гістарычнага развіцця і частага адыходу ад "першапачатковай сутнасці", ключавой ідэі ў яе чыстым выглядзе, якая вызначыла змястоўна-сэнсавае напаўненне феномена і прычыну яго з'яўлення. Прыродазгоднасць уяўляе сабой агульны закон станаўлення чалавека. Пры такім падыходзе анталагічным базісам выхавання выступае закон ідэалазгоднасці, які выяўляецца "ў прыватных законах ідэалу мэты, зместу, працэсу" [14, с. 68]. У той жа час зараджэнне і фарміраванне ідэй прыродазгоднага выхавання адбывалася ў кантэксце філасофскіх ведаў і дынамічна зменлівых гістарычных і сацыяльна-культурных умоў, што вызначае сувязь паміж яго інтэрпрэтацыяй і філасофіяй пэўнай гістарычнай эпохі, характарам яе культуры.

Даследуемы часавы прамежак працягласцю больш за дзесяць стагоддзяў дазваляе прасачыць працэс зараджэння першых ідэй прыродазгоднага выхавання ў айчыннай педагагічнай думцы і іх трансфармацыю ў іншыя формы навуковых ведаў.

*Фенаменалагічны падыход* нацэльвае на ўспрыманне і інтэрпрэтацыю гісторыка-педагагічных ведаў як "прадукту індывідуальнай і грамадскай свядомасці і вопыту", дае магчымасць вызначыць яго розныя аспекты як "індэксы суб'ектнага разумення" і выявіць "індывідуальна-гістарычныя траекторыі" фарміравання такіх ведаў [15, с. 16–17]. Педагагічная думка Беларусі X – пачатку XXI стагоддзя прадстаўлена плеядай мысліцеляў, педагогаў і асветнікаў розных гістарычных эпох, што, адпаведна, абумовіла спецыфіку іх светапоглядных установак, перакананняў і каштоўнасцей. Згодна з фенаменалагічным падыходам, ідэі прыродазгоднага выхавання прадстаўнікоў мінулага існуюць у нашым рэфлексіўным вопыце як даследчыкаў у межах культурна-гістарычнага быцця дадзеных педагагічных ідэй.

*Кампаратыўны падыход* дазваляе ажыццявіць параўнальны аналіз ідэй прыродазгоднага выхавання ў часе, гэта значыць, паміж этапамі яго генезісу ў Беларусі, што характарызуецца як вертыкальнае параўнанне. Суаднясенне тэндэнцый развіцця даследуемай педагагічнай з'явы ў айчыннай і заходнееўрапейскай педагагічнай думцы адносіцца да гарызантальнага параўнання, для якога ўласціва выяўленне агульнага і асаблівага ў рамках аднаго гістарычнага перыяду ў кантэксце міжнацыянальнай прасторы. Адзінства вертыкальнага і гарызантальнага зрэзаў дазваляе глыбока і поўна вывучыць гісторыю генезісу прыродазгоднага выхавання.

Даследчыцкія ўстаноўкі і планы, нараўне з сістэмай абумоўленых імі метадалагічных падыходаў, уяўляюць метадалагічную матрыцу даследавання генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі (малюнак 1).

У вызначэнні матрыцы мы зыходзілі з яе разумення як "даследчай мадэлі і нагляднай формы даследавання і рэпрэзентацыі дадзеных, якая раскрывае ўнутраныя сувязі паміж элементамі, якая дапамагае зафіксіраваць, вывучыць, і прааналізаваць часткі структуры якой-небудзь з'явы або працэсу" [16, с. 77].

**Заключэнне**

Такім чынам, метадалагічная матрыца даследавання генезісу прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі прадстаўлена сістэмай даследчыцкіх установак і базавымі, парадыгмальнымі, інструментальнымі падыходамі да пазнання працэсаў станаўлення і развіцця дадзенага феномена. Гэта абумоўлівае яго паэтапнае прадстаўленне ў кантэксце гістарычнага развіцця, змястоўна-сэнсавыя прырашчэнні і мадыфікацыі, а таксама дынаміку фарміравання канстытутыўна-рэгулятыўнага, каштоўнасна-мэтавага, змястоўна-працэсуальнага кампанентаў, што складаюць тэарэтыка-метадалагічныя асновы прыродазгоднага выхавання.

МГПУ им. И.П. Шамякина

| | ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ЎСТАНОЎКІ | | ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ПЛАНЫ | |
|---|---|---|---|---|
| **ПРАДМЕТ ДАСЛЕДАВАННЯ** працэс фарміравання і развіцця тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі | адносна сэнсавага значэння паняццяў, якія вызначаюць прадмет даследавання | **МЭТА ДАСЛЕДАВАННЯ** абгрунтаванне канцэпцыі генезісу і раскрыццё пераемнасці развіцця тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродзгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі | ***працэсуальны*** | выяўленне логікі і перыядаў фарміравання і развіцця даследуемага педагагічнага феномена |
| | адносна інтэрпрэтацыі гісторыка-педагагічнага працэсу як кантэксту даследавання | | ***суб'ектны*** | вызначэнне суб'ектаў педагагічнай думкі, якія транслююць ідэі прыродазгоднага выхавання і/альбо рэалізуюць іх на практыцы |
| | | | ***выніковы*** | выяўленне меркаванняў, канцэпцый і тэорый, якія адлюстроўваюць ідэі прыродазгоднага выхавання |
| | адносна мовы гісторыка-педагагічнага даследавання | | ***асяроддзевы*** | вызначэнне знешніх перадумоў генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання |
| | | | ***функцыянальны*** | выяўленне ўплыву даследуемага феномена на педагагічную навуку і адукацыйную практыку ў перыяды прошлага, цяперашняга і будучага |

**МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ**

| *базавыя* | | *парадыгмальныя* | | | *інструментальныя* | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| гісторыка-генетычны | сістэмны | цывілізацыйны | аксіялагічны | культуралагічны | анталагічны | фенаменалагічны | кампаратыўны |

**Малюнак 1 – Метадалагічная матрыца даследавання генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі**

## СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ


1. Булыгина, М. В. К вопросу о методологии региональных историко-педагогических исследований / М. В. Булыгина // Язык и культура. – 2008. – № 2. – С. 74–85.
2. Сутырина, Т. А. Генезис гуманистических идей в отечественной педагогической публицистике : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01 / Сутырина Татьяна Анатольевна ; Пед. акад. последипл. образования. – Екатеринбург, 2006. – 49 с.
3. Опираясь на многовековую историю / подг. к печ. Т. Шаблыко // Беларуская думка. – 2018. – № 8. – С. 11–23.
4. Легчилин, А. А. Белорусская философская традиция: история и современность / А. А. Легчилин, И. М. Бобков // Философские науки. – 2016. – № 7. – С. 29–38.
5. Бобрышов, С. В. Методология историко-педагогического исследования развития педагогического знания : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01 / Бобрышов Сергей Викторович ; Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – СПб., 2007. – 45 с.
6. Корнетов, Г. Б. История педагогики. Теоретическое введение : учеб. пособие / Г. Б. Корнетов, М. А. Лукацкий. – М. : АСОУ, 2015. – 492 с.
7. Корнетов, Г. Б. Педагогические идеи и учения в истории педагогики / Г. Б. Корнетов // Историко-педагогический журнал. – 2015. – № 2. – С. 44–68.
8. Челпаченко, Т. В. Историко-генетический подход к обоснованию дидактической системы В. А. Сухомлинского / Т. В. Челпаченко // Интеллект. Инновации. Инвестиции. – 2012. – № 2. – С. 96–100.
9. Боронилова, И. Г. Ретроспективный подход к изучению методологических основ теории передового педагогического опыта / И. Г. Боронилова // Вестник Восточной экономико-юридической гуманитарной академии. – 2010. – № 1. – С. 10–17.
10. Бобрышов, С. В. Система методологических подходов к изучению историко-педагогического процесса / С. В. Бобрышов // Вестник Костромского государственного университета им. Н. А. Некрасова. – 2006. – № 2. – С. 41–46.


МГПУ им. И.П. Шамякина

11. Бобрышов, С. В. Методология историко-педагогического исследования развития педагогического знания : дис. ... д-ра пед. наук : 13.00.01 / Бобрышов Сергей Викторович ; Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – Ставрополь, 2006. – 477 л.

12. Корнетов, Г. Б. Педагогика: теория и история : учеб. пособие. – 3-е изд., перераб., доп. / Г. Б. Корнетов. – М. : АСОУ, 2016. – 472 с.

13. История теории и практики образования : в 2 т. / под ред. Г. Б. Корнетова ; Акад. соц. управления. – М. : АСОУ, 2012. – Т. 1 : Теория истории педагогики. История образования и педагогической мысли за рубежом. – 244 с.

14. Постижение педагогической культуры человечества : в 2 т. / под ред. Г. Б. Корнетова. – М. : АСОУ, 2010. – Т. 1 : Общие вопросы. Зарубежный педагогический опыт. – 200 с.

15. Шиянов, Е. Н. Взаимосвязь онтологического и феноменологического подходов в теоретико-педагогическом исследовании / Е. Н. Шиянов, С. В. Бобрышов // Педагогика. – 2006. – № 6. – С. 10–19.

16. Кодан, С. В. Матрицы и матричный подход в технологиях анализа носителей юридической информации: место, понимание, виды / С. В. Кодан // Юридическая техника. – 2024. – № 18. – С. 75–82.

*Паступіў у рэдакцыю 31.03.2025*

E-mail: bgv78@mail.ru

G. V. Bolbas

RESEARCH METHODOLOGY
METHODOLOGY IN RESEARCH ON THE GENESIS OF THEORETICAL AND METHODOLOGICAL FOUNDATIONS OF NATURE-BASED EDUCATION IN THE PEDAGOGICAL THOUGHT OF BELARUS

The article substantiates the methodological matrix summarizing studies on the genesis of the phenomenon of nature-based education in the pedagogical thought of Belarus. The author defines research guidelines and plans that ensure the organization of historical and pedagogical knowledge and determine the basic, paradigmatic and instrumental methodological approaches to the study of the processes of formation and development of the pedagogical phenomenon. The systematicity and complexity of these approaches are associated with the specificity of historical and pedagogical research, manifested in the synthesis of pedagogical and historical sciences.

Keywords: nature-based education, pedagogical thought of Belarus, genesis, research guidelines, research plans, methodological approaches, methodological matrix.

МГПУ им. И.П. Шамякина